***М.В. Казлоў**, аспірант*
*БДЭУ (Мінск)*

# КАШТОЎНАСНЫЯ АРЫЕНЦІРЫ Ў ПАЛІТЫЧНАЙ НАВУЦЫ НА ПАДСТАВЕ ЕЎРАПЕЙСКАЙ І АТЛАНТЫЧНАЙ МЕТАДАЛАГІЧНАЙ ТРАДЫЦЫІ

Сучасная палітычная навука ўяўляе сабой важны напрамак у пазнанні актуальных працэсаў XXI ст. Свет мадэрна з развітымі камунікатыўнымі каналамі патрабуе ад гуманітарнага, у які ўключана і палітычная навука, дакладных, аператыўных і комплексных адказаў на пытанні, сутнасць якіх заключаецца ў трансфармацыі палітычнага ландшафту ва ўмовах глабалізацыі і канфліктаў. Але, на жаль, пры суадносінах розных падыходаў у разуменні палітыкі, узнікаюць некаторыя праблемы. У прыватнасці, найбольш важная асаблівасць палітычнай навукі крыецца ў яе падставе, якая прадстаўлена палітычнай тэорыяй. Гэтая характэрная рыса палітычнай тэорыі прасочваецца ў дваістасці яе высноў. Гэта разуменне выцякае з супрацьборства двух «класічных» традыцый у гэтай дысцыпліне. Найбольш выразна гэтая «барацьба» выявілася паміж прыхільнікамі нарматыўнага (еўрапейскага) і паводніцкага (амерыканскага) напрамкаў [1].

Такім чынам, да першага ўзроўню ставіцца інтэлектуальная дыскурсіўная прастора, да другога — дысцыплінарны дыскурс. Варта ўдакладніць, што супрацьстаянне паміж гэтымі напрамкамі існавала ў ЗША ў 30—60 гг. XX ст. (і, па ўсей бачнасці, існуе і сення). Асноўнае становішча гэтай дваістасці заключаецца ў тым, што і тая і іншая традыцыі (палітычная тэорыя) разглядаюць палітычнае як існуючае. У гэтым выпадку аб'ект перабудоўваецца ў залежнасці ад спосабу яго трактоўкі. Гэта значыць, што палітыку аналізуюць ў рамках пэўнага метаду або самой палітыкі і, што характэрна, гэта прызнаюць прадстаўнікі як аднаго, так і другога напрамку (І. Берлін, Б. Бары, Д. Ганнел). У прынцыпе даследчыкі разумеюць, што палітыка не абмяжоўваецца чымсьці адным, а ўяўляе сабой універсальную з'яву, якая пранікае ва ўсе сферы чалавечага жыцця. З гэтага факту выходзіць пазнанне палітыкі, дзе, па сутнасці, прысутнічаюць: гістарычная, нарматыўная, эмпірычная, ідэалагічная і інстытуцыйная «школы».

Сення пры асэнсаванні гістарычнага кантынууму палітычнай навукі паказваецца, што «класічныя працы» з'яўляюцца «протонаучными» (А. Салаўеў) [2], а сучасная палітыка разумеецца толькі ў сучаснасці. Асноўнае становішча ў гэтым ракурсе заключалася як раз у тым, каб аддзяліць палітычную філасофію ад палітычнай тэорыі і пазбавіць яе ад каштоўнаснай і маральнай форм. Такі крок быў зроблены амерыканскімі палітолагамі (Ч. Мерыам, Г. Гаральд, Г. Ласуэл). Гэтая спроба, як вядома, прынесла ў палітычную навуку зусім іншае разуменне палітыкі і ў першую чаргу «метад», але з часам гэта «аб'ектыўна» паказала на тое, што самі палітолагі сталі залежаць ад палітыкі, гэта значыць, ад свайго аб'екта даследавання. Яны, спрабуючы стварыць «навуковую» паліты-



БДЭУ. Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ. Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.°.
BSEU. Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by

ку, толькі спрыялі яе «дысцыплінарнай уладзе» (М. Фуко) [3], пры якой індывіды ператварыліся ў функцыі. З іншага боку, і гэта вельмі важна, амерыканскіх даследчыкаў не кранула хваля еўрапейскай сітуацыі, якая выявілася ў XX ст. Многія вядомыя еўрапейскія палітолагі (Л. Штраўс, Х. Арэнт, Г. Маркузэ) [4] былі вымушаны эміграваць у ЗША і ўступіць у барацьбу за «традыцыйную» палітычную навуку, якая не выключае з свайго арсеналу палітычную філасофію. Асноўнае сцвярджэнне іх заключалася ў тым, што палітолаг так ці інакш звязаны з палітыкай і, такім чынам, ен не з'яўляецца «нейтральным» і не свабодным ад каштоўнасцей. Палітыка не існуе ў дадзены момант, яна існавала і раней. Паўтаральныя факты з поспехам можна знайсці і ў працах Арыстоцеля. Нельга адкідаць або ігнараваць тое, што можа служыць яе падмуркам.

Але трэба разумець, што інтэлектуальныя баталіі аб магчымасці і немагчымасці «навуковай палітыкі», або «утопіяў» у рамках палітычнай філасофіі, прыводзяць да разумення палітыкі з пазіцыі сінтэтычнага меркавання (І. Кант) [5], якое у сваю чаргу вядзе да асэнсавання палітыкі з эмпірычнга і нарматыўнга боку. Такім чынам, выказваць праўдзівасць палітычнага фенамена, без звароту да іншых структур соцыума, немагчыма.

### Літаратура

1. Политическая теория в XX веке : сб. ст. — М. : Территория будущего, 2008. — 416 с.

2. *Соловьев, А. И.* Политология: Политическая теория, политические технологии / А. И. Соловьев. — М. : Аспект Пресс, 2006. — 559 с.

3. *Фуко, М.* Психиатрическая власть / М. Фуко. — СПб. : Наука, 2007. — 448 с.

4. Антология мировой политической мысли : в 5 т. / ред.-науч. совет: Г. Ю. Семигин. — М. : Мысль, 1997. — Т. 2 : Зарубежная политическая мысль. XX в. / ред.-сост. : Г. К. Ашин, Е. Г. Морозова. — 830 с.

5. *Кант, И.* Сочинения : в 6 т. / И. Кант. — М. : Мысль, 1965. — 544 с. — Т. 4, ч. 1.

***О.В. Анискевич***
***Ю.П. Козловская***, *канд. психол. наук, доцент*
*БГЭУ (Минск)*

## ЦЕННОСТНЫЕ ОРИЕНТАЦИИ БУДУЩИХ СПЕЦИАЛИСТОВ ЭКОНОМИЧЕСКОГО ПРОФИЛЯ

Проблема изучения ценностей является актуальной, так как, во-первых, нет единого подхода к трактовке понятия ценностных ориентаций; во-вторых, кардинальные изменения в политической, экономической, духовной сферах общества влекут за собой радикальные изменения в ценностных ориентациях и поступках людей. С помощью иерархии ценностей выстраиваются определенные цели и способы их дос-



БДЭУ. Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ. Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.°.
BSEU. Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by